Петрушкевіч, Ала. Успаміны аб Аляксее Карпюке [Электронны рэсурс] // facebook.com: асабістая старонка. – Рэжым доступу: https://www.facebook.com/ala.petrushkevich/posts/821993044566763. – Дата доступу: 09.08.2019. – фота.

Калі думаю пра Аляксея Карпюка, згадваю адзін выпадак з майго даўняга, студэнцкага, што было на самым пачатку 80-ых. У перапынку між лекцыямі стаю ля акна. Там – зялёны травень. Вуліца Ажэшкі аж зіхаціць свежасцю пасля цёплага вясновага дажджу. Ідзе Аляксей Карпюк. Ведаю яго як знакамітага пісьменніка, ведаю здалёк. Як і ўсе студэнткі, захапляюся ягонай “Данутай”. Раптам ён збочвае з ходніка і ідзе па траве, якраз пад акном. Згінаецца: перад ім жоўтая краска, адзіная на ўсім траўніку. Звычайны малачай – цудоўнае маленькае сонца між зялёнай травы. Нейкі час узіраецца, дакранаецца да пялёсткаў-промняў. Уздымаецца і сыходзіць. Вялікі, прыгожы, статны.

У гэтым для мяне ўвесь Аляксей Карпюк. Чалавек адначасна надзвычайнай моцы і пяшчотнай, далікатнай шчырасці, што з гадамі-выпрабаваннямі не страціў здольнасці выхапіць з зменлівай, вірлівай карціны гарадской штодзённасці аскепачак жывой прыроднай красы, умення глядзець на свет дзіцячымі вачыма, захапляцца і здзіўляцца. Гэта ключ да разгадкі таго, як між творамі, дзе малюецца далёка не радасная заходнебеларуская рэчаіснасць, паўстала ў ягонай спадчыне такая ўзнёслая, шчымліва-балесная аповесць “Данута”. - З мае кнігі "Старонкі Гарадзеншчыны літаратурнай". Але гэта не ўсё. Было яшчэ, пра што не напісала. Убачыўшы, што на нешта загледзелася, падышоў аднакурснік. Зарагатаў: "Гляньце, гляньце: пісьменнік, дурны, кветачкі збірае!" У адказ змагла толькі ў ягоным стылі выпаліць: "Сам ты дурны". Ведала, што ніхто з групы мяне не падтрымае. У маёй беларушчыне заўсёды заставалася адна. Як і сёння. Але ніколі не адна. Як і сёння.

***Ала Петрушкевіч***

Аляксей Карпюк і Уладзімір Бутрамееў каля Слонімскага РДК, 1987 г.

